**2016 m. pagrindinio ugdymo pasiekimų patikrinimo užduotis**

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

## Rašymas

Сачыненне

**Pagrindinė sesija**

**6 мая 2016 г.** **Час – 2,5 гадзіны**

**ТЛУМАЧЭННІ:**

- З трох прапанаваных заданняў выбярыце адно і выканайце яго.
- Ваш тэкст павінен быць аб’ёмам 250–350 слоў (прыблізна 1–1,5 старонкі фармата А4).
- Пасля таго, як работа будзе напісана, палічыце і напішыце прыблізную колькасць слоў у ёй (самастойных і службовых часцін мовы). Для гэтага вылічыце сярэдняе арыфметычнае колькасці слоў у першых пяці радках і атрыманую лічбу памножце на колькасць радкоў у вашай рабоце.
- Для чарнавіка і чыставіка выкарыстайце пазначаныя школьнай пячаткай аркушы. Не забудзьце напісаць сваё прозвішча, імя, жанр і адрасата пісьмовай работы.
- Пішыце выразна, разборліва, ручкай сіняга колеру. Ужываць карэктар забараняецца.
- Пасля заканчэння працы аддайце настаўніку і чыставік, і чарнавік. Чарнавік не правяраецца.

© Nacionalinis egzaminų centras, 2016

***Выбяры адно з трох прапанаваных заданняў і выканай яго:***

# А

Бессмяротныя тварэнні антычных скульптараў і архітэктараў, Рафаэля і Мікеланджэла, Дантэ, Петраркі, Моцарта, Баха, Чайкоўскага… Немагчыма ўявіць сабе, што наша жыццё не суправаджала б мастацтва, творчасць. Ёсць меркаванне, што мастацтва валодае велізарнай сілай уздзеяння на духоўнае жыццё асобы, грамадства, чалавецтва.

Напішы ліст сябру, у якім падзяліся сваімі думкамі наконт ролі мастацтва ў грамадстве, як яно ўплывае на чалавека, прывядзі прыклады ўзаемадзеяння розных відаў мастацтва.

**Жанр** – ліст сябру
**Адрасат** – твой равеснік

# Б

“Мы часта самі адчувалі, што адной кнігі мы не можам дачытаць, а другая чытаецца лёгка, ад яе нельга адарвацца. Усё ў ёй хораша, натуральна... І сакрэт гэтага майстэрства просты…” (*Ян Скрыган).* Паразважай над пытаннямі: у чым жа сакрэт **добрай** кнігі, чаму цікавасць да аднаго твора не знікае на працягу стагоддзяў, а другі твор нават сучаснікі аўтара не хочуць чытаць? Магчыма, галоўнае ў кнізе – займальны сюжэт? Ці майстэрства пісьменніка таксама мае значэнне?

Напішы сачыненне-разважанне на тэму “Добрая кніга заўсёды з намі”.

**Жанр** – сачыненне-разважанне

**Адрасат** – рознаўзроставая аўдыторыя

# B

У жыцці кожнага з нас бываюць хвіліны, калі трэба абавязкова расказаць пра тое, што адбываецца ў душы, распавесці пра гэта таму, хто зможа цябе зразумець, не перапыніць размову, не будзе з цябе кпіць, таму, хто заўсёды падзеліць з табой і радасць, і гора. Для большасці людзей гэта маці. "І калі б была воля мая на тое – пачаў бы я азбуку менавіта з літары М: як і ўсё на зямлі, усё ў нас пачынаецца з Маці", – пісаў беларускі паэт Рыгор Барадулін.

Напішы ў школьную сценгазету артыкул, у якім выкажы свае думкі на гэтую тэму. Не забудзь прыдумаць назву артыкула.

**Жанр** – артыкул для школьнай сценгазеты
**Адрасат** – вучні і настаўнікі школы